## Тэма 2. ВУСНАЯ НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ І БЕЛАРУСКАЯ ДЗІЦЯЧАЯ ЛІТАРАТУРА

**Вусная народная творчасць** – першааснова любой нацыянальнай літаратуры, у тым ліку і дзіцячай. У мінулым на Беларусі ва ўмовах жорсткага нацыянальнага ўціску і нізкага ўзроўню адукаванасці насельніцтва фальклор меў значна большае значэнне, чым у іншых краінах. Гэта была тая галіна духоўнага жыцця народа, якую дзяржава не магла узяць пад кантроль. Менавіта ў рэчышчы вуснай народнай творчасці стагоддзямі развівалася, шліфавалася і ўдасканальвалася роднае слова. У песнях, легендах, казках і паданнях беларусы выказвалі свае запаветныя мары і памкненні. Фальклорныя творы як найдаражэй-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Куле

шая духоўная спадчына беражліва перадаваліся ад аднаго пакалення да другога.

З даўніх часоў вусна-паэтычная творчасць на Беларусі спрыяла выхаванню высокіх грамадскіх ідэалаў, здаровых маральных прынцыпаў і мастацкага густу народа. Такую ж функцыю выконваў і дзіцячы фальклор (дарэчы, тэрмін «дзіцячы фальклор» узнік толькі ў пачатку XX ст., ім пачалі называць тую частку вусна-паэтычнай творчасці, якая адпавядае інтарэсам і запатрабаванням дзяцей рознага ўзросту). Як адзначае даследчыца дзіцячага фальклору Т.В. Зуева: «*Дзіцячы фальклор – спецыфічная галіна мастацкай творчасці, якая мае, у адрозненне ад фальклору дарослых, сваю паэтыку, свае формы бытавання і сваіх носьбітаў. Агульная родавая прыкмета дзіцячага фальклору – суаднясенне мастацкага тэксту з гульнёй*»[1].

Вядомая даследчыца фальклору Г.А. Барташэвіч адзначае: «*Хаця першыя ўзоры дзіцячага фальклору былі запісаны яшчэ ў пачатку XIX ст., сам тэрмін «дзіцячы фальклор» не ўжываўся ў фалькларыстыцы. Творы, якія збіральнікі называлі «дзіцячымі песнямі», «калыханкамі», «пацешкамі» і г. д., змяшчаліся ў фальклорных зборніках побач з абрадавай паэзіяй, часцей за ўсё далучаліся да радзінных, хрэсьбінных песень.*

*Тэрмін «дзіцячы фальклор» вельмі шырокі. Ён аб'ядноўвае ўсе віды вуснай народнай паэзіі, створанай дарослымі для дзяцей, і творчасць саміх дзяцей. Сюды ж уваходзяць і тыя творы, якія хаця і ствараліся для дарослых, але з цягам часу перайшлі ў разрад творчасці для дзяцей*»[2].

Паводле вызначэння Т.В. Зуевай, «*у сучаснай навуцы пра дзіцячы фальклор абазначыліся новыя праблемныя аспекты: дзіцячы фальклор і ўнутраны свет асобы дзіцяці, якая развіваецца; дзіцячы фальклор як рэгуля-*

---

[1]*Зуева, Т.В.* Детский фольклор / Т.В. Зуева // Литературная энциклопедия терминов и понятий / под ред. А.Н. Николюкина. М., 2000. С. 223.

[2]*Барташэвіч, Г.А.* Дзіцячы фальклор / склад. Г.А. Барташэвіч, В.І. Ялатаў. Мінск, 1972. С. 8. Далей пры цытаванні з гэтага выдання спасылкі будуць падавацца непасрэдна ў тэксце ў дужках.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*тар сацыяльных паводзін дзіцяці ў дзіцячым калектыве. Дзіцячы фальклор – частка народнай педагогікі*»[1].

Узнік дзіцячы фальклор, як і ўся вусна-паэтычная творчасць, у старажытныя часы, калі чалавек навучыўся працаваць, гаварыць, свядома радавацца, нудзіцца, ставіць пэўныя мэты, клапаціцца пра выхаванне дзяцей у адпаведнасці з тагачаснымі нормамі чалавечых узаемаадносін. У далейшым у фальклорных творах фіксуецца выхаваўчы вопыт народа; педагагічны талент бліскуча выявіўся ў шматлікіх калыханках, пацешках, пястушках, загадках, вершах, песнях, казках і інш.

Зразумела, што самыя раннія вусна-паэтычныя творы для дзяцей не дайшлі да нас: з часам адны з іх непазнавальна змяніліся, а некаторыя зусім зніклі, саступіўшы месца новым. Аднак у творах больш позняга паходжання можна выявіць такія адзнакі, якія сведчаць пра старажытнае ўзнікненне арыгінальных жанраў дзіцячага фальклору. Няма, напрыклад, ніякага сумнення адносна вельмі даўняга паходжання калыханак.

***Калыханкі.*** Даследчыкі дзіцячага фальклору грунтоўна даказалі іх сувязь з замоўнай паэзіяй, пра што сведчыць змест калыханак: яны ўзніклі тады, калі першабытны чалавек адухаўляў сілы прыроды, многія жыццёвыя з'явы і горача верыў у магчымасць уздзеяння на іх усхваляваным, пранікнёным словам. Песняй-калыханкай маці імкнулася ўплываць на лёс дзіцяці, шчыра верыла, што яе словы ўлагодзяць звышнатуральныя сілы, і тыя зберагуць яе малога ад сурокаў, ад усякіх няшчасцяў. Пра старажытнае паходжанне калыханак сведчаць і міфічныя вобразы, якія сустракаюцца ў гэтых песнях. У адной з калыханак фальклорнага зборніка Е. Раманава, уключанага ў кнігу «Дзіцячы фальклор», згадваюцца вобразы варкоты, дрымоты: «*А ты, коця, не вурчы, // А Рыгорка спі-маўчы. // На коціка варкота, // на Рыгорку сон-дрымота*» [76]. Такія вобразы ёсць і ў іншых калыханках, напрыклад: «*<...> На каточка варката, // На дзіцятка дрымата. // Прыдзі, каток, начаваць, // Дзіцятачка калыхаць. // На каточка варката, // На дзіцятка дрымата. // Засні, засні, ціха спі*» [73]. Варкота, сон-дры-

---

[1] *Зуева, Т.В.* Детский фольклор / Т.В. Зуева // Литературная энциклопедия терминов и понятий / под ред. А.Н. Николюкина, М., 2000. С. 223.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

мота, безумоўна, такія ж старажытныя міфічныя вобразы, як Сон, Дрымота, Угамон, што сустракаюцца ў рускім і ўкраінскім фальклоры. Паводле ўяўлення першабытных людзей, Варкота, Угамон, Дрымота і іншыя былі жывымі істотамі, якія дзейнічалі, рухаліся, дапамагаючы або, наадварот, перашкаджаючы дзіцяці хутчэй заснуць.

Вядома, што ў дзіцячых калыханках кот – самая папулярная істота: ён то ідзе на таржок і прыносіць малому піражок, то дапамагае маці закалыхаць малое і атрымлівае за гэта ўзнагароду, то прыносіць паясок, каб тужэй спавіць дзіця. Пра ката так часта спявалі таму, што ён быў у кожнай хаце, і дзеці яго добра ведалі, любілі, ім падабаліся яго мяккая поўсць, спрытныя і грацыёзныя рухі, гуллівасць.

Калыханкі ўсіх народаў свету, у тым ліку рускія, беларускія, украінскія, вызначаюцца павольным рытмам, своеасаблівай аднастайнай мелодыяй, задушэўнай лірычнасцю і цеплынёй. Гэтыя асаблівасці абумоўлены самой прыродай жанру: калыханкі спяваюцца з мэтай дапамагчы дзіцяці хутчэй заснуць – адсюль іх размераны спакойны рытм, спецыфічная пяшчотная напеўнасць. Лірычнасць і цеплыня калыханак ідуць ад сэрца маці: менавіта яна часцей за ўсё была складальніцай гэтых песень.

Ля калыскі зусім малога дзіцяці, якое яшчэ не разумела сэнсу слоў, маці спявала нескладанае «люлі-люлі» або «баю-баюшкі-баю», і тут галоўнымі былі мелодыя і рытм. Калі ж дзіця падрастала, толькі мелодыя і рытм калыханкі задаволіць яго ўжо не маглі, таму маці павінна была сваёй песняй зацікавіць малое, каб яно ўслухалася ў словы калыханкі, – гэта пераключала ўвагу дзіцяці, і яно супакойвалася. Вось чаму ўсе дзіцячыя калыханкі маюць хоць і нескладаны, але займальны сюжэт. Кожная калыханка нагадвае невялікае вершаванае апавяданне, якое дае багаты матэрыял для фантазіі і ўяўлення дзяцей; тут усё даступна іх успрыманню: і змест, і вобразы. Звычайна ў калыханках гаворыцца пра вядомых дзецям жывёл і птушак, часта ў такіх песнях называецца імя самога дзіцяці, што яму вельмі падабаецца: «*Пайшоў коцік на таржок, // Купіў Юрку піражок. // Пайшоў коцік на вулку, // Купіў Юрку булку, // Пайшоў коцік рэпку рваць, // Юрку трэба крэпка спаць*» [111].

Захапляе дзяцей і тое, што кот, гусі ці куры дзейнічаюць у калыханках зусім як людзі: размаўляюць, радуюц-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ца, перажываюць. Так, у многіх калыханках кот-свавольнік, які ўкраў з кухні прысмакі (печанае, мёд, смятану — тое, што і дзецям падабаецца), спрабуе паказаць сябе невінаватым («*Сядзела кошачка на кухні, // У яе вочкі папухлі. // — Чаго ж ты, кошачка, плачаш? // Ці піцькі, ці есцікі хочаш? // — Не піцькі, не есцікі хачу, // Па сваёй жаласці плачу: // Сам кухар пячонку злізаў, // На мяне, кошачку, сказаў, // Хоча мне лапкі адбіці. // Чым жа я буду хадзіці?*» [97]). Нездарма такія эпізоды адлюстраваны ў калыханках, бо падобныя сітуацыі здараюцца і ў паводзінах дзяцей (нешта забароненае зрабіла дзіця, а віну сваю ўскладае на іншых); у дадзеным выпадку ў жартаўлівай форме стваральнікі калыханак імкнуліся звярнуць увагу дзіцяці на тое, што падман становіцца ўсё ж відавочным. З другога боку, такія калыханкі, а таксама тыя, у якіх апавядаецца пра непрыемныя прыгоды жывёл, напрыклад таго ж ката («*Пайшоў коця па плоце // У шэранькай капоце, // Памарозіў лапкі, // Палез на палаткі. // Сталі лапкі грэцца, // Няма катку куды дзецца. // Палез ён вышай, // Дык баіцца мышай, // Палез бы далоўкі, // Дык баіцца варонкі*» [130–131]) — здольныя выклікаць у свядомасці дзіцяці пачуццё спагады, суперажывання і пяшчоты ў адносінах да жывёлы. З гэтым адчуваннем пяшчоты яно спакайней засынае.

Калыханкі не толькі даюць багаты матэрыял для развіцця фантазіі маленькіх дзяцей, але і вучаць іх вобразна мысліць і гаварыць, спрыяюць узнікненню адчування рытму, музыкальнасці тэксту.

У фальклорных зборніках зафіксаваны найбольш пашыраныя беларускія калыханкі, якія, як кажуць, адстаяліся і сталі традыцыйнымі. Мноства ж цудоўных нацыянальных калыханак-імправізацый беззваротна загінула. Часам ля калыскі малога маці, поўная любасці і замілавання да яго, спявала не вядомую калыханку, а сваю, новую. У некаторых выпадках гэтая песня замацоўвалася ў памяці, перадавалася ад аднаго пакалення да другога, распаўсюджвалася ў розных мясцовасцях. Часцей жа, праспяваўшы аднойчы ў адпаведным настроі калыханку, маці не магла больш паўтарыць яе, і песня забывалася.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Сярод беларускіх калыханак сустракаюцца такія, у якіх няма звычайнага, пашыранага ў гэтым жанры, забаўляльнага развіцця падзей. У такіх песнях закранаюцца сур'ёзныя сацыяльныя пытанні. Відаць, таму П. Шэйн і Е. Раманаў лічылі гэтыя калыханкі не дзіцячымі і не ўключылі іх у свае зборнікі. Аднак гэта ўсё ж арыгінальны тып песень-калыханак, і абысці яго ўвагай нельга. У зборніку Г.А. Барташэвіч «Дзіцячы фальклор» змешчана, напрыклад, такая калыханка: «*Не плач, маё дзяцятка, // А цыц, маё родна: // Вунь войт ідзе, // На татку, на мамку // Ён бізун нясе. // У тым бізуне // Скураты ўвіты, // На тым бізуне // Слёзкі паліты. // Тыя слёзкі крывавыя // З сэрца раненага… // Схавайся ты, дзетка, // На божу пасцельку, // Няхай твае вочкі // Заплюснуць навекі: // Не бачыў бы гора, // Гора мужыкова, // Не ўзнаеш долі, // Кроўкай палітое…*» [64].

Гэта надзвычай своеасаблівая калыханка, у якой не ўлічваецца ўзрост дзіцяці. Такая песня – выказаная ўслых горкая дума маці пра жыццё, невясёлы роздум над будучым дзіцяці. Відаць, закалыхаўшы малога, маці, працягваючы мелодыю калыханкі, у такт рухам калыскі спявала пра тое, што яе больш за ўсё хвалявала, – пра лёс дзіцяці.

Звычайна ж у народных калыханках не гаворыцца пра гора і пра трагічнае. І гэта невыпадкова: тонкі і ўдумлівы выхавацель – народ – разумеў, што песня пра жудаснае і страшнае можа запалохаць дзіця, зрабіць змрочным яго настрой. Складальнікі песень-калыханак хацелі, каб дзеці адчувалі сябе ў атмасферы прыязнасці і пяшчоты, таму пераважная большасць беларускіх народных калыханак вызначаецца мяккасцю гучання, яны светлыя і пяшчотныя; іх складальнікі паклапаціліся пра тое, каб напоўніць дзіцячыя сэрцы спакоем і лагодай, каб дапамагчы ім хутчэй і салодка заснуць.

Народ дбаў пра выхаванне ў дзяцей бадзёрасці, аптымізму. Творы беларускага дзіцячага фальклору былі разлічаны на тое, каб замацоўваць і ўзбагачаць падараваную дзецям самой прыродай здольнасць успрымаць жыццё ярка і светла.

Паводле вызначэння Т.В. Зуевай, «*дзіцячы фальклор выконваюць дарослыя для дзяцей (мацярынскі фальклор) і самі дзеці (уласна дзіцячы фальклор). Мацярынскі*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*фальклор складаюць творы, якія ўзнiклi ў асяроддзi дарослых для маленькiх дзяцей (да 5–6 гадоў). Яго асноўныя жанры – калыханкi, пястушкi, пацешкi, паскакушкi, прыгаворкi, небылiцы-перавёртышы – падахвочваюць дзiця заснуць альбо не спаць (рабiць пэўныя рухi, гуляць), у iх важнай з'яўляецца роля рытму, якi альбо заспакойвае, альбо бадзёрыць»*[1].

Многа радасцi прыносяць маленькiм дзецям ***забаўлянкi***, своеасаблiвымi формамi якiх з'яўляюцца *пястушкi i пацешкi.*

*Пястушкi* – вершаваныя радкi, якiмi дарослыя суправаджаюць першыя рухi дзяцей: *«Кую-кую ножку! // Паеду ў дарожку, // Куплю чаравiчкi // Малы-невялiчкi // На Валюшкiну ножку. // Кую-кую другую, // Паеду ў даўгую. // Дарожка – даўгая, // А ножка малая»* [212]. Альбо: *«Коў-коў ножку! // Паеду ў дарожку. // Трэба каня падкаваць, // Штоб далёка начаваць»* [213].

Рытмiчна прамаўляючы гэты тэкст, дарослы лёгенька пабiвае дзiця па пятцы, а потым казыча яго падэшву. Бадзёры вершык i адпаведныя дзеяннi дарослага выклiкаюць у дзiцяцi радасны настрой: яно гучна смяецца, весела, энергiчна б'е ручкамi i ножкамi.

*Пацешкi* – невялiкiя вершы, песнi з захапляльным жартаўлiва-гумарыстычным зместам, у якiх (у адрозненне ад пястушак) адбываецца сюжэтнае развiццё дзеяння, для якога ўласцiвы iмклiвасць i дынамiзм. Дзецi любяць гуляць са сваiмi ручкамi, ножкамi, i такая гульня падтрымлiваецца, стымулюецца дарослымi з дапамогай забаўлянак-пацешак; яна выклiкае ў малых добры настрой. Вось прыклады такiх песень: «*Сарока-варона // Дзеткам кашку варыла, // На прыпечку студзiла. // Гэтаму дала, гэтаму дала, // Гэтаму дала, гэтаму дала*[2]. *//* *А гэтаму* [мезенцу. – *Рэд.*] – *не дала: // – А ты, мал, круп не драў, // Вады не насiў, дзяжы не мясiў. // Iдзi, малы, па вадзiцу, // Табе кашка на палiцы // У маленькай чарапiцы*» [213, 214]. «*Сарока-варона кашку варыла, //*

---

[1]*Зуева, Т.В.* Детский фольклор / Т.В. Зуева // Литературная энциклопедия терминов и понятий / под ред. А.Н. Николюкина. М., 2000. С. 223.
[2]Па чарзе, пачынаючы з вялiкага пальчыка дзiцяцi, выканаўца забаўлянкi лёгенька цярэбiць астатнiя, за выключэннем мезеннага (альбо датыкаецца да iх сваiм пальцам).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*У палоннічку дзяліла. // Гэтаму, гэтаму, гэтаму, гэтаму дала. // А табе* [мезенцу. – *Рэд.*], *маленечкі, на палічцы, // Малачком забелена. // Схадзі і вазьмі. // Тут пень, тут калода, // Тут мох, тут балота, // Тут крыніца, а тут зімная вадзіца*» [213, 214].

«*Забаўлянкі неаддзельны ад гульні з пальцамі, з рукамі, ножкамі дзіцяці,* – адзначае Г.А. Барташэвіч, – *яны ж суправаджаюць і розныя рухі, якія робіць дзіця само альбо з дапамогай дарослых: гушканне, качанне наназе, пацягванне ручак, першыя крокі і г.д. Часам яны выконваюцца і без пэўных рухаў, напрыклад, калі трэба супакоіць дзіця, якое плача, або рассмяшыць яго. Тыповая ў такіх выпадках забаўлянка «Не плач, куплю калач». <...> Яны не спяваюцца, а прыгаворваюцца, вымаўляюцца рэчытатывам у рытме пэўнага дзеяння, рухаў, якія пры гэтым выконваюцца. У забаўлянках, як і ў калыханках, яскрава праяўляецца імправізацыя*» [18].

Малым вельмі падабаецца паслядоўнасць і хуткая змена дзеяння забаўлянкі, дзе кожны радок – новая прыгода. Але забаўлянкі не толькі радуюць дзяцей і выклікаюць у іх бадзёры настрой. Яны, акрамя таго, вучаць малых звязваць паміж сабой пэўныя падзеі, праз забаўлянкі дзеці пачынаюць набываць цікавыя для іх звесткі пра навакольны свет. Багацце інтанацыйных адценняў, паўторы, лаканізм і рытмічнасць забаўлянак станоўча ўплываюць на развіццё мовы дзяцей. У забаўлянках выяўляецца спроба праз гульню, забаву навучыць дзяцей правільна ацэньваць учынкі і дзеянні людзей. Забаўлянка пра сароку-варону, напрыклад, не назаляючы, тлумачыць дзецям: малы не атрымаў кашы таму, што не працаваў.

***Песні.*** У фальклорных зборніках можна знайсці мноства чароўных беларускіх песень, большасць з якіх паводле зместу жартоўныя або гумарыстычныя. Сюжэты ў беларускіх дзіцячых песнях больш разгорнутыя ў параўнанні з сюжэтамі забаўлянак і калыханак. У адной песні можа быць некалькі падзейных ліній, магчымы нечаканыя павароты дзеяння. Відаць, такія песні спяваліся дзецям, якіх пястушкі і забаўлянкі задаволіць ужо не маглі.

Сама песня, яе змест, вобразы – вось што цікавіць малых, бо яны ўжо могуць самі многае зразумець і дадаць ад сябе, самастойна або з дапамогай дарослых вызначыць свае адносіны да пачутага. Так, напрыклад, песня «Камар

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

лазню тапіў...», можа, і не была складзена спецыяльна для дзяцей, але з часам трывала перайшла ў раздзел дзіцячых (яна змешчана ў зборніку «Дзіцячы фальклор»), бо імпануе імкненню малых да незвычайнага, дзіўнага: «*Камар лазню тапіў, // Муха парылася. // Дылі-дылі-дылі, // Го-ца-ца-ца. // Ой, дыль-дыль-дыль, // Го-ца-ца-ца*[1]. //\ *Ды з палка зваліласе // І на смерць забілася. //\ Едзе жук да папа, // Да запечнага клапа. //\ А поп часу не мае, // Прусака спавядае. //\ Прэ блаха на мышы. // Ужо муха без душы. //\ Покуль муху памылі, // Пак лучыны спалілі. //\ Покуль муху прыбралі, // Певуны запялі. //\ Зайцы яму капалі, // Лісы труну збівалі. //\ Совы муху няслі, // Ваўкі голас вялі. //\ У пясочку хавалі // І памінкі спраўлялі. // Выпілі ўсе, галасілі, // Выпілі, закусілі*» [231, 232].

У прыведзенай песні ўсё незвычайнае, і дзеці добра разумеюць яе жартоўны змест; яна выклікае ў малых бадзёры настрой, вясёлы смех.

У іншай жа песні – «Як у бабушкі каза...» – ідзе, напрыклад, гутарка пра казла, з якім здарылася бяда: ён, пайшоўшы «*Ў чыста поле пагуляць // Да па ельнічку, па бярэзнічку*» [310], спаткаўся з шэрым ваўком, але не ведаў, каго сустрэў у лесе – ці *ваўка*, ці *заіньку*, і, не разабраўшыся, хто перад ім, запрапанаваў пабарацца, перакінуцца сілай. Але засталіся ад казла ў выніку такога выпрабавання сілы толькі «*рогі пад дарогай*» ды «*галоўка пад ялушачкай*» [311]. Тут дасціпна высмейваецца наіўнасць і адначасова самаўпэўненасць казла.

Дзеючыя асобы дзіцячых песень – птушкі (верабей, шчыгол, бусел, сава, перапяліца, дзяцел, сойка і інш.), жывёлы (заяц, мядзведзь, воўк, конь, казёл, каза, бык, кот і інш.). Яны надзяляюцца рысамі, якія ўласцівы чалавеку (самаўпэўненасць, хітрасць, даверлівасць, упартасць і інш.), пападаюць у складаныя сітуацыі, на вырашэнне якіх уплываюць згаданыя рысы. Падобныя песні вызначаюцца не толькі павучальным, але і пазнавальным зместам. Яны вучаць дзяцей назіральнасці, спрыяюць развіццю ў іх здольнасці да параўнанняў, аналогій, супастаўленняў.

[1]Прыпеў «*Дылі-дылі-дылі* <...> *Го-ца-ца-ца*» паўтараецца пасля кожнай страфы.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Дзіцячыя песні, таксама як калыханкі і забаўлянкі, характарызуюцца канкрэтнасцю малюнкаў і мастацкіх вобразаў, займальнасцю, дынамічнасцю сюжэтаў.

Найбагацейшым скарбам дзіцячага фальклору з'яўляюцца казкі.

***Казка*** – адзін з асноўных жанраў народнай творчасці – невялікіх памераў твор, змест якога напоўнены незвычайным, фантастычным, цудадзейным, магічным; героі яго – звычайныя людзі і людзі, надзеленыя звышнатуральнымі асаблівасцямі, насельнікі прыроднага свету, незвычайныя істоты – свабодна пераходзяць са свету рэальнага ў свет нерэальны і наадварот, становячыся пры гэтым на шлях дапамогі добрага добраму, барацьбы светлага з цёмным дзеля самай галоўнай мэты такой узаемападтрымкі і барацьбы: дасягнення героямі казкі той мэты, якая першапачаткова акрэсліваецца ў ёй і дзеля здзяйснення якой разгортваюцца ўсе падзеі твора. Як правіла, у казцы перамагаюць светлыя сілы і пазітыўныя героі; гэтым самым сцвярджаецца ідэя ўзвышэння светлага над змрочным, добрага над злым. Для казак уласцівы ўстойлівая традыцыйная кампазіцыя (паказальнымі яе элементамі з'яўляюцца зачын і канцоўка), кантрастны падзел герояў на пазітыўных і негатыўных (добрых і злых), барацьба добрага са злым, шчаслівы фінал гэтай барацьбы.

Казкі падзяляюцца на народныя (фальклорнага паходжання) і літаратурныя («Рак-вусач» Я. Коласа, «Мурашка-Палашка» Зм. Бядулі і інш.). Паводле зместу сярод іх вылучаюць тры групы. *Казкі пра жывёл* («Зайкава хатка», «Лёгкі хлеб», «Коцік, певень і лісіца», «Дурны воўк» і інш.) – дзеючымі асобамі ў іх з'яўляюцца жывёлы, якія надзяляюцца тыповымі рысамі чалавечага характару (хітрасць, мудрасць, сквапнасць, баязлівасць і інш.) і ўласцівасцямі чалавека (жывёлы, птушкі мысляць, размаўляюць і інш.). У сусветным фальклоры вядома каля 140 сюжэтаў казак пра жывёл. *Чарадзейныя* («Каток – залаты лабок», «Іванька-ліпавік», «Піліпка», «Музыка-чарадзей» і інш.) – заснаваны на вымысле аб цудадзейным; у той жа час у такіх казках фантастычнае спалучаецца з рэальным. У іх дабру супрацьстаяць чарадзейныя сілы, а дапамагаюць яму цудадзейныя прадметы; цудадзейнымі памагатымі чалавека ў гэтых казках даволі часта выступаюць жывёлы. *Сацыяльна-бытавыя* («Мужык і пан»,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

«Два маразы», «Недалікатны сын» і інш.) – вызначаюцца вострым сацыяльным зместам, іх герой звычайна – бедны селянін, работнік ці салдат; у іх адлюстроўваюцца незвычайныя прыгоды героя, якія развіваюцца без удзелу чароўных сіл. Калі ж у сацыяльна-бытавых казках і з'яўляюцца чароўныя сілы, то яны неабходныя для таго, каб выявіць рэальны жыццёвы канфлікт. Тут герой сутыкаецца найперш са складанымі жыццёвымі абставінамі, з якіх ён выходзіць жывым дзякуючы нечаканаму шчасліваму павароту падзей альбо ўласнай вынаходлівасці.

Збіральнікамі беларускіх народных казак з'яўляюцца П. Шпілеўскі, П. Шэйн, А. Глінскі, У. Дабравольскі, Е. Раманаў, А. Сержпутоўскі, М. Федароўскі, Я. Карскі, І. Крук, А. Фядосік, К. Кабашнікаў, Н. Гілевіч і інш.[1] У XX ст. беларускія народныя казкі сабраны, напрыклад, у зборніку «Казкі ў сучасных запісах» (1989) з серыі «Беларуская народная творчасць».

Большасць казак перайшла ў дзіцячы фальклор ад дарослых. Казкі для дзяцей апублікаваны, напрыклад, у зборніку «Беларускія народныя казкі» (1990), якія апрацаваў А. Якімовіч. Некаторыя з іх увайшлі ў праграму выхавання і навучання дзяцей у яслях-садку «Пралеска»[2].

Асноўная жанравая адметнасць казкі – устаноўка на выдумку, фантазію. Казка не ведае абмежаванняў ні ў часе, ні ў прасторы; асноўнае ў ёй – дзеянне, учынкі персанажаў. У ёй увасоблены гісторыя, жыццёвы вопыт, светапогляд, талент і мудрасць народа. Казкі падабаюцца дзецям, задавальняюць іх патрэбу ў яркім, незвычайным. На здзіўленне лёгка і натуральна дзіця ўваходзіць у казачны свет і гэтак жа лёгка вяртаецца ў рэальнасць, уносячы ў яе элементы казачнага. Казкі ўздзейнічаюць на дзяцей эстэтычна, даюць незабыўныя ўрокі народнай маралі, вучаць сумленнасці, сціпласці, працавітасці, душэўнай чуласці і дабрыні. Яны таксама актыўна ўплываюць на мову дзяцей, дапамагаюць ім адчуць прыгажосць роднага слова, мудрасць народа.

---

[1] Гісторыя збірання і вывучэння дзіцячага фальклору пададзена ў наступнай крыніцы: *Барташэвіч, Г.А.* Дзіцячы фальклор / Г.А. Барташэвіч, В.І. Ялатаў. Мінск, 1972. С. 5–8.
[2] Пралеска. Мінск, 2000. С. 216, 353.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Казка – любімы жанр дзяцей і дзейсны сродак выхавання. Казка ніколі не знікае, як ніколі не знікне мара народа, прага яго да новых маральных вышыняў.

Сярод пісьменнікаў, якія садзейнічалі папулярызацыі беларускай народнай казкі (Я. Колас, Цётка, М. Багдановіч, Зм. Бядуля, У. Дубоўка, С. Шушкевіч і інш.[1]), асабліва вылучаецца А. Якімовіч. Ён таленавіта апрацаваў больш за 200 беларускіх народных казак, якія добра вядомы чытачам па зборніках: «Каток – залаты лабок» (1955), «Бацькаў дар» (1957), «З рога ўсяго многа» (1959), «Андрэй за ўсіх мудрэй» (1983), «Людзей слухай, а свой розум май» (1987).

Казкі непрыкметна накіроўваюць пачуцці і думкі дзяцей у рэчышча маральных вывадаў і абагульненняў, дапамагаюць зразумець сутнасць добрага і злога ў жыцці. У іх займальна, даступна, у адпаведнасці з узростам і асаблівасцямі дзіцячага ўспрымання, падаюцца звесткі пра навакольны свет, які для маленькіх дзяцей абмяжоўваецца даволі вузкім колам прадметаў, з'яў, паняццяў, а для старэйшых – больш шырокім і складаным. Так, шасці-сямігадовым і старэйшым дзецям няцяжка зразумець маральна-павучальны сэнс казак «Іван-рыбак», «Жораў кашалёк», «Пану навука», «З рога ўсяго многа», «Як Сцёпка з панам гаварыў», «Лёгкі хлеб», «Не сілай, а розумам», «Як кот звяроў напалохаў», «Селянін, мядзведзь і лісіца», «Залаты птах», «Музыка-чарадзей» і інш.

У разрад дзіцячага фальклору ўваходзяць таксама наступныя жанры: заклічкі, прыгаворы, дражнілкі, лічылкі, загадкі.

***Заклічкі*** – *«кароценькія прыгаворы або песні, якія звернуты да сонца, дажджу, насякомых, птушак, раслін»* [24]. Паколькі ў старажытнасці адбывалася адухаўленне прыродных з'яў, то, як адзначае Г.А. Барташэвіч, заклічкам у той час надаваўся магічны сэнс.

Праз многія заклічкі адбываецца зварот да сонца як да крыніцы дабрабыту (*«Свяці, свяці, сонейка...»*), да дажджу, які пазбавіць ад засухі (*«Зубі, зубі, дождж, // На*

[1]Больш падрабязна пра намаганні гэтых і іншых пісьменнікаў у справе папулярызацыі беларускай народнай і літаратурнай казкі, пра творчасць беларускіх пісьменнікаў у жанры казкі гутарка ідзе ў адпаведных манаграфічных раздзелах.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*бабіну рож, // На дзедаву плеш, // Дзецям на кулеш»* [360]). Такія заклічкі з цягам часу сталі неад'емнай часткай гульняў дзяцей, якія, назіраючы, напрыклад, за перажываннямі дарослых з-за засушлівага лета, пераносілі іх занепакоенасць у свой дзіцячы свет («*Ідзі, ідзі, дожджыку, // Звару табе боршчыку. // Пастаўлю пад елкаю, // Накрыю талеркаю, // Сама пакаштую, // Цябе пачастую*» [361]).

І ў цяперашні час дзеці, асабліва ў вёсцы, даволі часта, убачыўшы на траве, зямлі, раслінах божую кароўку, альбо заклікаюць яе ляцець на неба, альбо пытаюцца аб надвор'і заўтрашняга дня.

*«Божая кароўка, // Ты ляці на небка, // Там твае дзеткі // Кушаюць катлеткі. // Усім даюць, // А табе не даюць»* [367–368].

*«Божая кароўка, // Што заўтра будзе – Дождж ці пагода, // Пень ці калода? // Пагода – ляці, // Дождж – сядзі»* [363–364].

Заклічкі пра божую кароўку выконваюць яшчэ і выхаваўчую функцыю. З даўніх часоў лічыцца для дзіцяці небяспечным пакрыўдзіць гэтае Божае стварэнне, бо яго аберагае Неба.

***Прыгаворы*** – невялікія вершы, якімі дзеці суправаджаюць свае дзеянні: збіранне грыбоў, іканне, купанне і інш. («*Грыбок, выстаў лабок: // Я цябе пацалую*» [371]. Альбо: «*Ехала ікаўка // На сівой кабыле. // Кабыла пала, // Ікаўка прапала*» [374]).

***Дражнілкі*** – «*невялікія вершаваныя творы, у якіх высмейваецца «супраціўнік», яго імя, знешні выгляд, рысы характару і г.д.*» [25]. У такіх дражнілках абыгрываецца імя «супраціўніка» («*Андрэй-верабей // На кадушцы сядзеў. // Усіх жаб пераеў, // Адну не даеў // І жывот забалеў*» [378]), рысы яго знешнасці («*Сівы, па чом слівы? // Як па рублю – дык куплю, // Як па пяць – дык хай яны згараць*» [382]).

***Лічылкі*** – «*невялікія вершаваныя гумарыстычнага характару творы, з дапамогаю якіх вызначаецца чарговасць у гульні, выбіраюцца дзеючыя асобы або вядучыя*» [25]. Лічылкі адносяцца да гульнявога фальклору. У лічылках важнае значэнне выконвае рытм, яны, як правіла, маюць сваю кампазіцыю і невялікі закончаны сюжэт («*Раз, два, тры, чатыры, пяць, // Выйшаў месяц пагу-*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*ляць, // А за месяцам луна. // Аставайся ты адна»* [395]). Лічылкі паводле паходжання падзяляюцца на некалькі груп: тыя, што перайшлі ў разрад дзіцячых, створаныя дзецьмі і лічылкі з літаратурных твораў.

***Загадка*** – невялікі тэкст, у якім прапануецца пытанне, што мусіць быць разгаданым з дапамогай прыкмет таго прадмета (альбо з'явы), аб якім ідзе гутарка; у той жа час у загадцы могуць утрымлівацца прыкметы, якія ўжытыя з мэтай заблытаць таго, хто мусіць знайсці адказ на загадку (*«Без ног бяжыць, без воч глядзіць»* (Вада). *«Мяне ўсе просяць, мяне ўсе чакаюць, як толькі з'яўлюся – хавацца пачынаюць»* (Дождж). *«Пад адным брыльком семсот казакоў»* (Мак))[1].

Загадкі заўсёды былі не толькі сродкам выпрабавання разумовых здольнасцей (такая форма іншасказання выкарыстоўвалася, напрыклад, у пасольскай справе, вясельных абрадах), але і спрыялі развіццю вобразнага мыслення, інтэлектуальнай вынаходлівасці чалавека. Гэтая іх функцыя не згубіла свайго значэння і зараз, калі загадкі, страціўшы сваё шырокае грамадскае значэнне, сталі сродкам забавы і пацехі для дзяцей. Яны садзейнічаюць развіццю назіральнасці, фарміраванню абстрактнага, аналітычнага, вобразнага мыслення. Спрабуючы знайсці адгадку, дзеці, гуляючы, нязмушана вучацца праводзіць параўнанні паміж відавочнай прыкметай прадмета ці з'явы і вобразным іх азначэннем.

Напрыклад, каб разгадаць загадку *Ляжыць пад ганкам, хвост абаранкам*, дзіця мусіць звярнуцца да вызначэнняў, параўнанняў, супастаўленняў. Прычым гэты працэс можа развівацца ў залежнасці ад асаблівасцей мыслення дзіцяці ў двух напрамках: 1) лагічным, 2) вобразным. Сэнс першага з іх у наступным: а) вызначэнне апорных для адгадкі слоў (*ляжыць пад ганкам*); б) высвятленне, што азначае гэты выраз (= хтось пастаянна знаходзіцца каля хаты); в) высвятленне таго, хто пастаянна ляжыць каля хаты (= хтосьці, хто мае хвост, = жывёла); г) высвятленне сэнсу вобраза *хвост абаранкам* (= мае закругленую форму); д) высвятленне, у каго з хатніх жывёл *хвост абаранкам* (= у сабакі). Сутнасць другога у

---

[1]*Кабашнікаў, К.П.* Беларускі фальклор: Хрэстаматыя / К.П. Кабашнікаў [і інш.]. Мінск, 1996. С. 420–421.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

наступным: а) асэнсаванне значэння вобраза *хвост абаранкам* (= мае закругленую форму); б) праекцыя сэнсу вобраза *хвост абаранкам* на вонкавыя прыкметы вядомых дзіцяці жывёл (= сабака); в) праекцыя магчымай адгадкі на кантэкст першай часткі загадкі (= сабака можа ляжаць каля ганка хаты).

Пададзеныя вышэй алгарытмы ў кантэксце працэсу разгадвання – гэта вельмі хуткія формы мысліцельных дзеянняў, бо адна з умоў загадкі – хуткасць знаходжання адгадкі. У рэчаіснасці яны (алгарытмы) могуць быць і іншымі. Але падобны парадак адгадвання павінен выбудоўваць для сябе выхавацель (настаўнік) пры падрыхтоўцы да заняткаў (гульняў), на якіх будуць выкарыстоўвацца загадкі. І гэтыя алгарытмы, калі выхаванцы не змогуць хутка (альбо ўвогуле) знайсці адказ на загадку, дапамогуць выхавацелю (настаўніку) эфектыўна павесці дзяцей па шляху альбо лагічнага, альбо вобразнага разгадвання загадкі. Гэта ў сваю чаргу спрыяе фарміраванню лагічнага, вобразнага мыслення дзіцяці.

Вялікае значэнне выконваюць творы вуснай народнай творчасці (у тым ліку і дзіцячы фальклор) у дзіцячай гульні. Паводле вызначэння Т.В. Зуевай, «*фальклор, які выконваецца самімі дзецьмі, адлюстроўвае іх асабістую творчую актыўнасць у слове, арганізуе гульнявыя дзеянні дзіцячага калектыву. У яго ўваходзяць творы дарослых, якія перайшлі да дзяцей, і творы, якія ўзніклі ў дзіцячым асяроддзі. Паэзію рухомых гульняў складаюць жараб'ёўкі, лічылкі, гульнявыя прыгаворкі і прыпеўкі. Да паэзіі слоўных гульняў адносяцца заклічкі, прыгаворкі, скорагаворкі, маўчанкі, галасянкі. Да дзіцячых слоўных гульняў можна аднесці казкі і загадкі, якія выконваюцца ў дзіцячым асяроддзі. У фальклоры сучасных дзяцей шырока распаўсюджаны новы жанр – страшылкі. Паводзіны дзіцяці ў дзіцячым калектыве рэгулюе дзіцячая сатыра: дражнілкі, насмешкі, мірылкі, адгаворкі*»[1].

Фальклорныя творы спрыяюць фарміраванню ў дзяцей вобразнага мыслення, уменняў арыентавацца ў разнастайнасці лексічных значэнняў знаёмых і новых слоў, урэшце – першапачатковым уменням словатворчасці. Не сакрэт, што

---

[1]*Зуева, Т.В.* Детский фольклор / Т.В. Зуева // Литературная энциклопедия терминов и понятий / под ред. А.Н. Николюкина. М., 2000. С. 223–224.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

многія дзеці, якія захапляюцца казкамі, самі спрабуюць іх складаць і пераказваць сваім бацькам альбо сябрам.

Акрамя таго, як адзначае вядомы псіхолаг М.С. Мухіна: «*Народныя творы служаць узорамі кароткай і глыбокай думкі, іх сінтаксічная структура выразная, дакладная, а лексіка заўсёды разнастайная і вобразная. Антонімы, сінонімы, фразеалагізмы маюць спецыфічна псіхалагічны змест, устаноўкі і ацэнкі. Уласна кажучы, гэтыя з'явы моўнай культуры даюць незнарок устаноўкі на пэўнага кшталту сацыяльныя спадзяванні, якія звернуты да кожнага чалавека, менавіта ў гэтых перлах моўнай культуры фарміруюцца нацыянальны характар, нацыянальная ментальнасць, менавіта праз кантэкст моўных нюансаў складваецца сістэма каштоўнасных арыентацый і прэтэнзіі на прызнанне*»[1].

Пачуцці, эмоцыі, якія ўзнікаюць у дзіцячай свядомасці пры ўспрыняцці фальклорных твораў, маюць вельмі важнае выхаваўчае значэнне: яны здольныя затым праецыравацца ў дзіцяці на эмацыйны фон стасункаў з рэальнымі людзьмі, пераносіцца ў сферу адносін з роднымі, сябрамі і нават чужымі людзьмі. У гэтым сэнсе вусная народная творчасць – неацэнны выхаваўчы скарб, якім павінны карыстацца бацькі, кожны выхавацель, настаўнік, яна спрыяе выхаванню дасціпнага чалавека, асобы, якая неабыякавая да чужой бяды, здольная суперажываць іншаму, а пры неабходнасці з гумарам і трапна рэагаваць на разнастайныя сітуацыі чалавечых узаемаадносін.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова